СУСТРЭЧЫ

# ДЛЯ РАСКРЫЦЦЯ І РАЗВІЦЦЯ

**Паэтэса Кацярына Каламійцава выступіла перад старшакласнікамі гродзенскай сярэдняй школы № 3 імя В. Усава.**

На мерапрыемстве прысутнічалі члены школьнага літаратурага гуртка, а таксама вучні 10-11 класаў, якія цікавяцца літаратурай і літаратурным жыццём. Кацярына Аляксееўна падрабязна пазнаёміла падлеткаў з уласнай творчасцю, а таксама зрабіла прэзентацыі індывідуальных і калектыўных выданняў, у якіх яна паўдзельнічала апошнім часам.

Лістападаўская сустрэча з лаўрэатам IV Абласнога конкурсу рукапісаў імя Цёткі (Алаізы Пашкевіч), членам Саюза пісьменнікаў Беларусі, гродзенскай паэтэсай Кацярынай Каламійцавай стала падзеяй для ўсіх – для гаспадароў і самой госці. У аўтарскім прачытанні прагучалі як апублікаваныя вершы паэтэсы розных гадоў, так і зусім новыя творы. Праграму выступлення склалі філасофская, грамадзянска-патрыятычная, духоўная і інтымная лірыка. Кацярына Каламійцава – шматгранны талент, адрозніваецца яркай, выразнай манерай дэкламацыі вершаў (якасць сярод паэтаў вельмі рэдкая). Для яе паэтычнага слова ўласцівыя эмацыянальнасць, багатая вобразнасць, асацыятыўнасць, а таксама запрашэнне чытача (слухача) да дыялогу, да сатворчасці. Менавіта такі, творчы дыялог паэтэсы і зацікаўленай моладзі адбыўся 13 лістапада ў Гродзенскай СШ № 3 імя Віктара Усава па запрашэнні школьнага літаратурнага гуртка. Юныя аматары мастацкага слова са шчырай цікавасцю ўспрынялі знаёмства з пісьменніцай і яе творчай спадчынай, слухалі выступленне вельмі ўважліва, задавалі пытанні. У фінале мерапрыемства, якое доўжылася значна больш запланаванага часу, маладыя літаратары атрымалі ў падарунак ад гродзенскай паэтэсы кнігу з аўтарскім аўтографам.



Літаратурная сустрэча адбылася ў межах спецыялізаванага праекта, ініцыятар якога настаўніца беларускай мовы і літаратуры Дар'я Іванаўна Казіміровіч. Паводле задумы педагога, прэзентацыі творчасці, дыспуты, майстар-класы з удзелам членаў Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі плануецца праводзіць у школе рэгулярна. Тым больш, што ў адукацыйнай установе створаны і дзейнічае літаратурны пакой «На Нёманскай хвалі» – тэматычная школьная пляцоўка, наведвальнікі якой маюць магчымасць атрымаць інфармацыю пра пісьменнікаў, якія жывуць на тэрыторыі горада Гродна і Гродзенскай вобласці. Майстры літаратурнага мастацтва – тут частыя госці.

**Для даведкі.** Аб'яднанне па інтарэсах «Маё слова» мае мастацка-маўленчую накіраванасць і арыентавана на развіццё асобы навучэнца, фарміраванне і ўдасканаленне яго творчых здольнасцей, талентаў, задавальненне індывідуальных патрэб навучэнца ў інтэлектуальным, маральным, эстэтычным удасканаленні, арганізацыю вольнага часу, прафесійную арыентацыю. Галоўным сродкам камунікацыі з'яўляецца слова. Але ў апошні час склалася крызісная сітуацыя ў адносінах да ўсіх жанраў, звязаных з мастацтвам слова. Моладзь перастала актыўна чытаць мастацкую літаратуру, якасную публіцыстыку; прыгожае пісьменства, рытарычнае майстэрства для сучасных дзяцей і падлеткаў амаль страціла сваю значнасць. Таму мэта праекта: стварыць умовы для раскрыцця і развіцця творчага патэнцыялу вучняў, удасканалення іх здольнасцей шляхам далучэння да адпаведнага іх інтарэсам і здольнасцям творчага асяроддзя. На занятках з цыкла «Творчая майстэрня» вучні, члены аб'яднання па інтарэсах «Маё слова» спрабуюць сябе ў ролі пісьменніка, ствараюць свае ўласныя творы на вольную тэму. Адмысловай формай працы з'яўляюцца сустрэчы з айчыннымі майстрамі слова, сучаснымі пісьменнікамі Прынёмання.

*Ініцыятар і кіраўнік праекта,*
*настаўнік беларускай мовы і літаратуры*
*гродзенскай СШ № 3 імя В. Усава Казіміровіч Дар'я Іванаўна*

**САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ**
**ГРОДЗЕНСКАЕ АБЛАСНОЕ АДДЗЯЛЕННЕ**

**На фота:** член Саюза пісьменнікаў Беларусі, гродзенская паэтэса Кацярына Каламійцава ў гасцях у членаў літаратурнага гуртка, які дзейнічае ў гродзенскай сярэдняй школе № 3 імя Віктара Усава (кіраўнік настаўніца беларускай мовы і літаратуры Д. І. Казіміровіч). Літаратурны пакой «На Нёманскай хвалі». 13 лістапада 2025 года.




ЛІТАРАТУРНАЯ ГРОДЗЕНШЧЫНА








Гучаць апублікаваныя і зусім новыя творы паэтэсы




Адбываюцца прэзентацыі кніг






Падарунак для бібліятэчкі школьнага літгуртка




СРЕДНЯЯ ШКОЛА №3 имени В. М. Усова
г. ГРОДНО